ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 250 (1217) ПАНЯДЗЕЛАК, 27-га кастрычніка 1930 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

РАЗЬВІНАЙЦЕСЯ У ЭСТАФЭТНЫМ МАРШЫ

СТАРТ ДАДЗЕН,—ПОЎНЫ ХОД ЭСТАФЭЦЕ!

Культэстафэта пашла ўдарным маршам па ўсіх кутках Беларусі, заклікаючы да барацьбы за ўсеагульнае навучаньне, за політэхнічную школу, за беларускую, пролетарскую па зьместу і нацыянальную,—па форме культуру, на змаганьне з опортуністымі ў справе культурнага будаўніцтва

Сёньня дэманстрацыя, прысьвечаная культэстафэце. Выходзьце на дэманстрацыю

ФІНІШ—IX ЗЬЕЗД УсеЛКСМ

25-га кастрычніка ў памяшканьні Менскага Дзяржаўнага Тэатру адбыўся ўрачысты вечар, прысьвечаны дачы старту культэстафэце.

Вечар пачаўся а 8-ай гадзіне ўступным словам старшыні Ўсебеларускага Штабу тав. Бялугі. У сваёй прамове тав. Бялуга адзначыў політычнае значэньне ўсеагульнага навучаньня, неабходнасьць падрыхтоўкі для нашай растучай прамысловасьці політэхнічных кадраў і задачы, якія выплываюць у сувязі з гэтым.

Зьнішчыць апошнія рэшткі

Ленінскі комсамол, які ўвесь час нашай барацьбы ішоў у першых шэрагах барацьбітоў, сапраўды па-ленінску ацаніў важнасьць гэтай задачы і ўзяў шэфства над усеагульным навучаньнем.

Па усім Савецкім Саюзе праводзіцца культэстафэта. З некаторым спазьненьнем комсамол Беларусі і ўся наша грамадзкасьць уключыліся ў эстафэту. Справа культэстафэты ёсьць справа барацьбы за культурную рэволюцыю і адначасова з гэтым,—справа барацьбы за прамфінплян.

Усе маршруты нашай культэстафэты накіраваны для таго, каб зрабіць рашучы зрух у справе барацьбы за новую школу, барацьбы за новага чалавека.

Комсамол, які ўзяў на сябе шэфства, патрабуе дапамогі ўсёй пролетарскай грамадзкасьці. Без мобілізацыі грамадзкай думкі, усіх сіл,—ні комсамол, ні НКА самі зрабіць нічога ня змогуць.

Справа культэстафэты павінна быць популярызавана. Толькі ўрачыстай дачай старту справа культэстафэты вырашана ня можа быць, таму неабходна ўсімі сродкамі змагацца за популярызацыю ідэі культэстафэты, ле задач з тым, каб уцягнуць у гэтую справу ўсіх працоўных, усё пролетарскае студэнцтва і культпрацаўнікоў.

Неабходна з усёй рашучасьцю ўдарыць па клясаваму ворагу, які імкнецца спэкуляваць нашымі цяжкасьцямі, ударыць па нацыянал-дэмократах, якія зьяўляюцца агентамі заможнага фашызму, і правых ухілістых, опортуністых, якія ня вераць у творчыя сілы пролетарыяту і яго здольнасьці перамагаць цяжкасьці.

Закасаўшы рукавы, змагацца за культурную рэволюцыю, за насьпяховае правядзеньне культэстафэты і пад кіраўніцтвам ленінскай партыі мы і на гэтым фронце пераможам!

Апошнія словы пакрываюцца магутнай хваляй воплескаў.

У прэзыдыум абраны штаб культэстафэты: тав. Сянькевіч (ад ЦК КП(б)Б), тав. Бэнэк (урад БССР), Палякоў (ЦК ЛКСМБ), прадстаўнікі фабрык і заводаў, вайсковых частак і студэнцтва.

У ганаровы прэзыдыум аднагалосна пад бурныя воплескі абрана політбюро ЦК УсеКП(б) і тав. Орджанікідзэ, ЦК КП(б)Б і тав. Калінін.

Першае слова ад імя ўраду атрымаў тав. Бэнэк.

Змагацца за кадры —задача дню

У сваёй прамове тав. Бэнэк адзначыў, што тыя гіганцкія тэмпы нашага будаўніцтва, тэмпы, якіх ня ведае ніводная капіталістычная краіна, надзвычайна востра ставяць пытаньне барацьбы за кадры. Пытаньне кадраў у сваю чаргу ўпіраецца ў справу ўзьняцьця культурнага ўзроўню працоўных, якія былі-б здольны аўладаць навейшай тэхнікай, нашай растучай прамысловасьці.

Лепшая частка нашай інтэлігенцыі злучыла свой лёс з лёсам усяе рабочае клясы, гэтая частка сапраўды аддалася нашай барацьбе і яна павінна быць як-мага лепш скарыстана для нашага будаўніцтва.

Ленін калісьці сказаў, што перамагчы можа толькі пісьменны народ, і за гэты пісьменны народ мы павінны змагацца з тым, каб сапраўды ўвесь пролетарыят мог аўладаць нашай тэхнікай і каб рэшткі няпісьменнасьці, бязкультурря былі канчаткова зьнішчаны.

Правядзеньне ўсеагульнага навучаньня адыгрывае гістарычнае значэньне. Мы даем старт культэстафэце на 13 годзе нашай пролетарскай рэволюцыі і справа ўсеагульнага навучаньня зьяўляецца сапраўды гістарычным актам перамагаючага пролетарыяту.

Апошнія падзеі паказалі, што варожая нам частка інтэлігэнцыі, якая яшчэ не парвала з мінулым, выходзіць супроць пролетарыяту шляхам шкодніцкіх актаў і злачынства. У адказ на гэта мы павінны ўзмоцніць тэмпы падрыхтоўкі кадраў, даць нашай прамысловасьці сапраўды клясава-вытрыманыя пролетарскія кадры.

Ленінскі комсамол ішоў на ўсіх франтох у першых шэрагах барацьбы. Зараз ён узяў шэфства над усеагульным навучаньнем, гэта ёсьць сапраўды ленінскі падыход да справы. І трэба спадзявацца, што пад кіраўніцтвам нашай ленінскай партыі мы будзем здольны дагнаць і перагнаць перадавыя ў эканамічным становішчы капіталістычныя краіны і дабіцца сапраўдных посьпехаў на гэтым фронце.

Працягваць пачатую барацьбу

Тав. Паляkoў у сваёй прамове адзначыў ролю комсамолу ў нашым будаўніцтве, яго змаганьне за генэральную лінію партыі.

Комсамол,—кажа тав. Паляkoў,—увесь час змагаўся за прынцыпы Леніна, за яго заветы, Ленін казаў, што ў краіне няпісьменных пабудаваць комуністычную грамаду нельга, а гэта значыць, што нам трэба з краіны няпісьменнай зрабіць краіну пісьменную, культурна-разьвітую ва ўсіх галінах.

Комсамол змагаўся за політэхнічную школу і пасьля доўгай барацьбы пры падтрыманьні нашай партыі і грамадзкасьці ён перамог опортуністычныя ўстаноўкі Ціпаўскай падрыхтоўкі кадраў, ён дабіўся таго, што ФЗВ стала сапраўды ўзаконенай адзінаверпай політэхнічнай школай.

Яшчэ і зараз сустракаюцца варожыя адносіны да гэтай школы, яшчэ і зараз некаторыя організацыі імкнуцца сарваць будаўніцтва ФЗВ, паставіць палкі ў колы комсамолу, у яго барацьбе за політэхнічную школу. У барацьбе за політэхнічную школу комсамол змагаўся і зараз пад кіраўніцтвам нашай партыі і надалей будзе змагацца.

Не дапусьціць скарачэньня культпрацы

Тав. Клімковіч (ЦСПСБ) у сваёй прамове сказаў, што сёньняшні вечар—вечар дачы старту—зьяўляецца пачаткам масавога паходу за культуру, культуру пролетарыяту.

У свой час мы нядольны былі ўдзяляць максымум увагі справе культурнага будаўніцтва. Мы прымушаны былі экономіць на школах, і зараз мы ўжо маем усе магчымасьці паставіць пытаньне рубам. Няпісьменнасьці ў нашай краіне—не павінна быць.

Трэба адзначыць яўна-опортуністычную практыку некаторых організацый, якія не дааценьвалі політычнае значэньне барацьбы за культурную рэволюцыю, усякімі сродкамі імкнуліся перашкаджаць нам у гэтай рабоце. Па некаторых акругах опортуністыя дабіліся таго, што закрылі па 5 рабочых клюбаў. У Бабруйску зачынілі лепшы ў Беларусі Дом Фізкультуры. А такіх фактаў можна прывесьці багата.

Трэцяга фронту няма

Мы зараз знаходзімся ў становішчы агульнага наступу пролетарыяту па ўсіх франтох соцыялістычнага будаўніцтва,—сказаў у сваёй прамове тав. Платун. (НКА). У гэты-ж час некаторыя імкнуцца разглядаць культурны фронт, як трэці фронт і ва ўсёй працы адносяцца да яго, як да трэцяраднага. Культурны фронт зьяўляецца неадрыўнай часткай усяго нашага фронту і адносіньне яго да трэцяга фронту павінна быць біта.

У наш час ня можа быць нейтралітэту. Нейтралітэт—шкодніцтва. Нейтральным працаўнікам у нашых шэрагах няма месца, бо сёньня яны з намі, а заўтра—з ворагам. Трэба паставіць пытаньне—з кім: або з намі, або з ворагам. Трэцяга няма. Шмат хто стаў з намі і разам з імі мы павінны змагацца.

Комсамол мае сваё дзецішча—ФЗВ і ШКМ. Гэтыя дзецішчы комсамолу павінны быць падтрыманы і барацьба за гэтыя школы павінна працягвацца з усёй упартасьцю надалей.

Комсамол і цэлы шэраг іншых організацый яшчэ ня сталі на чале барацьбы за ўсеагульнае навучаньне.

Далей выступалі прадстаўнікі заводу „Комунар", прадстаўнік вайсковых частак і пролетарскага студэнцтва.

Прадстаўнік студэнцтва, тав. Лахмановіч, сказала, што студэнцтва мала яшчэ прыцягнута да гэтай справы, і той факт, што на вечары няма студэнцтва—сьведчыць аб гэтым.

Вынесеная рэзолюцыя была прынята аднагалосна.

З гэтым вечарам быў дадзен старт эстафэце. Радыё разьвясло па ўсіх кутках Беларусі прамовы ўдзельнікаў вечару.

Трэба адзначыць некаторыя тэхнічныя нехопы ў пастаноўцы гэтага вечару.

К старту ня былі прыцягнуты масы. Студэнцтва і рабочай моладзі на вечары было зусім мала. Шмат месц пуставала.

Старт дадзен.

Фініш—IX зьезд УсеЛКСМ. Трэба, каб вечар старту не застаўся толькі добрым успамінам. З дачай старту неабходна мобілізаваць усю грамадзкую думку, усе організацыі на справу барацьбы за ўсеагульнае навучаньне, за політэхнічную школу, за ўсеагульную ліквідацыю няпісьменнасьці. Толькі пры пасьпяховым ажыцьцяўленьні пастаўленых перад культэстафэтай лёзунгаў мы прыйдзем да фінішу з поўнымі паказчыкамі бальшавіцкіх перамог.

Лёзунгі да культэстафэты

1. Правядзеньне ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці павінна стаць баявой задачай партыі ў бліжэйшы час. (З рэзол. 16 зьезду УсеКП(б).

2. Барацьба за кадры—барацьба за соцыялізм.

3. Навуку на службу соцыялістычнага будаўніцтва.

4. Выкананьне задач партыі ў галіне культурнага будаўніцтва ёсьць задача ня толькі органаў народнае асьветы, але і ўсёй грамадзкасьці.

5. Барацьба за політэхнічную школу ёсьць барацьба за пяцігодку, за кадры, за клясавае комуністычнае выхаваньне.

6. Усеагульная пісьменнасьць—неабходная ўмова пасьпяховай барацьбы за соцыялізм.

7. Выканаем заветы Леніна—створым сапраўды політэхнічную школу.

8. Абавязковае навучаньне і ліквідацыя няпісьменнасьці—баявая задача клясавага выхаваньня працоўных мас, задача змаганьня за соцыялізм.

9. Мы павінны ўзяцца з простую, неабходную справу мобілізацыі пісьменных для барацьбы з няпісьменнасьцю (Ленін).

10. Усю работу органаў Нарасьветы—пад грамадзкі кантроль працоўных мас.

11. Культэстафэта — лепшы сродак мобілізацыі працоўных мас на барацьбу за культурную рэволюцыю.

12. Павядзем бязьлітасную барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з беларускім нацыянал-дэмократызмам і ўсімі скажэньнямі лініі партыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

13. „Перамагчы народам няпісьменным, някультурным нельга" (Ленін).

14. „Галоўнае зараз—перайсьці на абавязковае пачатковае навучаньне. Я кажу—галоўнае, бо такі пэрыод адзначыў-бы рашучы крок у справе культурнае рэволюцыі" (Сталін).

15. „Політэхнізм можа ў значнай ступені згладзіць цяжкасьці, зьвязаныя з хуткімі тэмпамі рэконструкцыі. Марудзіць з гэтай справай нельга" (Крупская).

16. Няхай жыве культура, нацыянальная па форме і соцыялістычная па зьместу.

17. Ператворым клюбы, нардамы і хаты-чытальні ў сапраўдныя вогнішчы культуры і комуністычнага выхаваньня мас.

18. Паставім усю культурна-масавую работу рабочых клюбаў на службу прамфінпляну.

19. Масавую політасьветную работу на вёсцы—на службу соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

20. Няхай жыве КП(б)Б—адзіны кіраўнік культурнага будаўніцтва.

21. Комсамолец, тваё месца ў першых шэрагах барацьбітоў за культурную рэволюцыю.

22. Комсамолец зьяўляецца шэфам над усеагульным навучаньнем,—гэта накладае абавязак на кожнага комсамольца штодзённа змагацца за ўсеабуч.

23. Праз культэстафэту ўцягнем у справу культбудаўніцтва тысячы працоўных.

24. Пролетарыі і колгасьнікі,—усе ў шэрагі культармейцаў. Усе на барацьбу за ўсеабуч.

25. Барацьба за ўсеабуч—барацьба за пяцігодку.

26. Сувязь навучаньня з продукцыйнай працай—магутная зброя ў руках пролетарыяту для стварэньня новага чалавека—будаўніка соцыялізму.

27. Буржуазія ўтварае з пролетарыяту нявольнікаў машын. Толькі вызвалены пролетарыят можа выхаваць з іх творцаў.

28. Асноўная адзнака савецкае школы—політэхнізм.

29. Соцыялізму патрэбны не нявольнікі машын, а іх творцы і вынаходцы. Такіх людзей мы створым толькі праз політэхнічную школу.

30. Завкомы і фабкомы, рабгаварвайце работу школы, змагайцеся за ператварэньне яе ў сапраўды працоўную школу.

31. Толькі ў школе політэхнічнай—выхаваньне комуністычнае.

32. Кіно і тэатры—на службу політэхнізацыі!

33. Пісьменнасьць—неабходная ўмова поўнага вызваленьня жанчыны.

Работніцы і сялянкі,—усе ліквідуйце сваю няпісьменнасьць.

34. Кожны пісьменны бяры культшэфства над няпісьменным і малапісьменным, навучы яго пісьменнасьці.

Усебеларускі штаб культэстафэты.

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б

па інформацыі сэкратароў раённых камітэтаў і старшынь РВК Тураўскага, Грэскага, Жыткавіцкага, Каханаўскага, Крупскага, Чэрвеньскага і Гарадоцкага раёнаў аб ходзе асеньняй пасеўнай кампаніі.

1. Адзначыць, што з боку гэтых раёнаў дырэктывы партыі аб выкананьні плянаў засеву ў жыцьцё не праведзены.

2. За невыкананьне дырэктыў партыі па пытаньнях пасеву і скарачэньня плянаў пасеву, даных Наркомземам, бюро Жыткавіцкага, Каханаўскага і Грэскага раёнаў КП(б)Б абвясьціць вымову з апублікаваньнем у друку.

3. Прыняць да ведама заявы сэкратароў Тураўскага і Крупскага раённых камітэтаў КП(б)Б, што плян, запрапанаваны Наркомземам, цалкам імі прыняты і выконваецца,

4. Справу аб невыкананьні Гарадоцкім райкомам КП(б)Б заданьня ЦК па сяўбе перадаць у ЦКК КП(б)Б. Прасіць прэзыдыум ЦКК разгледзець гэту справу і ўнесьці прапанову ў ЦК.

5. Запрапанаваць усім раённым камітэтам КП(б)Б ужыць самыя рашучыя меры да хутчэйшага скончэньня асеньняй пасеўнай кампаніі і поўнага выкананьня плянаў, прынятых ЦК.

Перазаключэньне колдагавароў—важнейшае пытаньне дня.

Ласты газэты „Чырвоная Зьмена" рапартуюць:

Бюлетэнь падрыхтоўкі і перазаключэньня колдагавароў

№ 3	Выдаецца раз у 5 дзён	№ 3

На заводзе „Бальшавік" распачалася праверка выкананьня колдагавароў. Створаныя праверачныя камісіі працуюць бяз удзелу мас.

На пабудове Менскай абутковай фабрыкі слаба разгортваецца праверачная кампанія.

Не чакаць апошняга дня. Кажны дзень скарыстаць для лепшай падрыхтоўкі і праверкі старых колдагавароў і заключэньня новых.

Комсамол павінен стаць на чале правядзеньня гэтай кампаніі.

Менскі чырвонаштандартны завод „Бальшавік"

На менскім гарбарным заводзе „Бальшавік" працуюць рабочыя брыгады па абсьледваньню выкананьня колумовы.

Брыгадамі выяўлен шэраг фактаў парушэньня старой колумовы, як рабочымі, так, і асабліва, адміністрацыяй.

У лаечным цэху з адпушчаных на пабудову вэнтыляцыі 14.000 рублёў выкарыстана толькі каля 3-х тысяч руб.

Вада ва ўмывальніках і душах падаецца не рэгулярна.

Выдаецца дрэннай якасьці спэцвопратка.

У аптэчках няма мэдыкамэнтаў. У памяшканьнях—сьмецьце і гразь. Нагляддаюцца звыштэрміновыя работы.

У жалацінным цэху яшчэ не пабудаваны тамбур, хаця і адпушчаны на гэта сродкі.

Рабочыя, бывае, ня выконваюць заданьняў. Вытворчасьць працы ня ўзьнята, яшчэ вялікі процант прагулаў і спазьненьняў.

Трэба падкрэсьліць, што цэхпрафбюро слаба кіруе праверачнымі брыгадамі, а гэта адбіваецца на тэмпе іх работы. Праверка выкананьня колдагавароў зацягваецца.

Завкому і профцэхбюро патрэбна зьвярнуць належную ўвагу на мобілізацыю жывое думкі рабочае масы заводу вакол гэтай важнай політычнай кампаніі.

МІНЬКІН.

Пабудова Менскай абутковай фабрыкі

Комсамольская ячэйка — у баку ад працы на праверцы колумоў. Рабачком пабудовы абутковай фабрыкі ўжо даўно атрымаў цыркуляр ЦП саюзу з конкрэтнымі пытаньнямі да праверкі колумоў, але яшчэ не мобілізаваў рабочых на правядзеньне гэтай важнай працы. У брыгадзе па праверцы ўдзельнічае ўсяго 9 чалавек з 100 чалавек рабочых пабудовы.

Комсамольская ячэйка пабудовы ніякага ўдзелу ў праверцы ня прымае. Эканом-працаўнік ячэйкі, як за ўвесь час нічога не зрабіў, так і зараз нічога ня робіць па праверцы. Замест організацыі комсамольскай брыгады па праверцы ён нават і сам адмовіўся працаваць у брыгадзе рабачкому.

Брыгады выявілі, што справа з перазаключэньнем колумовы праводзіцца ня зусім добра. Акты камісіі Аховы Працы валяюцца і ў кладаўшчыка і ў табельшчыка, але толькі ня там, дзе ім патрэбна быць.

Характэрнае становішча з рацыяналізацыяй.

— Колькі рабочых прапаноў унесена па рацыяналізацыі? — пытаецца брыгада ў працаўніка-рацыяналізатара, які павінен спэцыяльна займацца гэтым пытаньнем.

— Ніводнае,—адказвае ён.

Гэта ў той час, калі на пабудовах шмат яшчэ недахопаў у працы. Рацыяналізацыя зьведзена на такую нізкую ступень з прычыны дрэннага ўдзелу рабачкомаў, комсамольскай і парт. ячэек у гэтай працы.

Яшчэ ня позна. Рабачком разам з комсамольскай ячэйкай павінны як сьлед узяцца за мобілізацыю мас, каб праверку колумоў правесьці сапраўды масава.

І. СОКАЛ.

У ХВАСЬЦЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ТЭМПА[Ў]

У той час, як партыя заклікала рабочую клясу і ўсю працоўную грамадзкасьць на штурм гаспадарчых цяжкасьцяй, на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады,

калі водгульлем на гэты кліч узьнялася магутная хваля ініцыятывы і рэволюцыйнага энтузіязму рабочае клясы і шырокіх працоўных мас,—

кіраўніцтва ЦСПСБ, адгарадзіўшыся ганебнай шырмай цыркуляршчыны,—опортуністычна бязьдзейнічала, аказалася няздольным стаць на чале бальшавіцкіх тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Уліць жывы струмень у габінэты ЦСПСБ,—аднавіць кіраўніцтва за лік лепшых ударнікаў

На старонках газэт „Труд" і „Зьвязда" за апошнія дні друкаваўся шэраг матар'ялаў, якія абвінавачваюць ЦСПСБ у няздольнасьці стаць на чале ўздыму рабочых мас.

— „Опортунізм на практыцы, непаваротнасьць, закарапеласьць, дзялянцтва, няўменьне ўзьнімаць пытаньне на прынцыповую політычную вышыню, адарванасьць ад мас—характэрныя рысы работы кіраўніцтва ЦСПСБ",—так характарызуе работу ЦСПСБ „Зьвязда".

Якія-ж факты сьцьвярджаюць такую ацэнку работы ЦСПСБ?

У пачатку гэтага году друк Беларусі сыгналізаваў, што профорганізацыі, у пытаньні мобілізацыі мас на барацьбу з цяжкасьцямі на вытворчасьці, нічога не зрабілі. Значная частка віны падала на прэзыдыум ЦСПСБ, які ў сваёй пастанове ад 4-га студзеня прызнаў гэтыя факты. Але справа далей ня рушылася.

Падрыхтоўка кваліфікаванай рабсілы, барацьба за політэхнізацыю нашай школы, пытаньне падрыхтоўкі кадраў праходзіла бяз усякага ўдзелу профсаюзу. Шэраг зьмешчаных па старонках нашага друку артыкулаў не знаходзіў водгуку ў профсаюзах і ЦСПСБ. У выніку і па сёньня пытаньне падрыхтоўкі кадраў на Беларусі застаецца ня вырашаным.

Шырокая хваля ўздыму энэргіі, энтузіязму рабочых мас, значна абагнала профсаюзнае кіраўніцтва, якое—дзякуючы сваёй непаваротнасьці, няўменьню прыслухацца да голасу рабочых мас, не падхапіла рабочай ініцыятывы, не перанясло вопыт лепшых прадпрыемстваў на ўсю Беларусь.

Так было і з грамадзкім буксірам, так здарылася і з організацыяй скразных брыгад.

А вытворчыя манэўры, якія маюць вялікае політычнае значэньне, былі падхоплены ЦСПСБ толькі пасьля настойлівага патрабаваньня друку, які неаднакроць паказваў на сваіх старонках вопыт іх організацыі і політычнае значэньне іх правядзеньня, сыгналізаваў аб недастатковым кіраўніцтве профсаюзамі справай складаньня і правядзеньня сустрэчных промфінплянаў.

Мы нядаўна пісалі аб працы ЦСПСБ сярод 25-тысячнікаў. Яна выявілася ў скліканьні адной конфэрэнцыі, рашэньні якое нават і да гэтага часу нікому не вядомы. Праца па падрыхтоўцы профсаюзаў да веснавой пасеўкампаніі прайшла міма кіраўніцтва.

Праца нашых клюбаў не падначалена барацьбе за выкананьне промфінпляну. Яшчэ да гэтага часу цэнтр цяжару культработы не перанесен у цэх. Праца бібліотэк не прыстасавана да абслугоўваньня рабочых. Мы маем значныя прарывы ў музтэхнікуме і іншых культурных організацыях, але ўсё гэта ня тычыцца „культурнага" кіраўніцтва ЦСПСБ.

Друк неаднокраць сыгналізаваў аб адсутнасьці беларусізацыі, як у нізавых профячэйках, так і ў ЦП саюзаў і ў ЦСПСБ.

Пытаньні барацьбы з беларускім нацыянал-дэмократызмам, з вялікадзяржаўным шовінізмам, з антысэмітызмам не знашлі свайго адбітку ў працы профсаюзаў.

Быў выпадак, калі на прэзыдыуме Гомельскага ОПБ стаяла пытаньне аб антысэмітызьме рабочага аднаго з заводаў Гомельшчыны, дык кіраўнік ОПБ, тав. Эпштэйн імкнуўся расцаніць гэты выпадак, як хуліганства, і толькі пасьля настойлівага патрабаваньня з боку прафактыву і сяброў прэзыдыуму „згадзіўся" прызнаць гэта хуліганства антысэмітызмам.

Ня было такога выпадку, каб ЦСПСБ узьняў на прынцыповую політычную вышыню праявы вялікадзяржаўнага шовінізму ў нізавых профячэйках, аб якіх неаднокраць сыгналізаваў друк.

Мы на сёньнешні дзень маем поўны правал фізкультурнага руху ў профсаюзных гуртках, а бюро фізкультуры пры ЦСПСБ спачывае на лаўрах. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб фізкультуры да гэтага часу ЦСПСБ ня выканана.

Комсамол Беларусі праводзіў трохмесячнік беларускай пролетарскай і нацмен. культуры, але і гэта мерапрыемства прайшло міма ЦСПСБ.

Культработа профсаюзаў ня скранута з мёртвай кропкі.

Няма такога ЦП саюзу, дзе-б ня было прадстаўніка моладзі, але няма такога профсаюзу, дзе-б ён працаваў.

Маладзёжныя прадстаўнікі працуюць сэкратарамі ЦП і інш., толькі не працаўнікамі сярод моладзі.

Ні адна нізавая профэсыйная комсамольская ячэйка ня можа пахвастацца малай-мальскай дапамогай з боку „маладзёжных „паўпрэдаў" у профсаюзах. Сёньня ўжо не патрэбна агітаваць за неабходнасьць глыбокай працы сярод моладзі ў профсаюзах. Гэта ведае кожнае дзіцё.

Што-ж у гэтым напрамку рабіў ЦСПСБ?—Нічога.

Шэраг адказных працаўнікоў заўкомаў і фабкомаў расказваюць як яны кіравалі: папера, пратаколы, цыркуляры, і... ўсё.

Рабочы заводу „Энэргія", т. Майзэльс, кажа, што працаўнікоў ЦСПСБ на заводзе амаль ня ўбачыш. Аб гэтым гавораць рабочыя „Бальшавіка", „Комунара" і г. д.

Гэта—у Менску, як-жа ў астатніх мясцох Беларусі?

Нам прышлося быць сьведкай такога зьявішча, калі прадстаўнік ЦП саюзу Хэмікаў на шклозаводзе „Кастрычнік" тав. Крэнь 10-га верасьня атрымаў тэлеграму аб неабходнасьці прапрацоўкі адозвы ЦК УсеКП(б).

10-га верасьня! Праз тыдзень пасьля таго, як адозва была зьмешчана ў друку. Гэтыя тэмпы ЦП Хэмікаў зьяўляюцца характэрнымі для ЦСПСБ.

Вось у кароткіх рысах факты, характарызуюць работу ЦСПСБ. Іх трэба толькі дадаць, што ўсе сыгналы друку разьбіваліся аб ЦСПСБ, як аб каменную сьцяну. Іх чыталі, гаварылі, калі-ні-калі давалі газэты працаўнікоў, часам выносілі пастановы, а далей справа [ру]шылася.

Патрабавалася ўмяшаньне „Труд", патрабавалася рэзка пастаўленае пытаньне аб зьмене опортуністычнага кіраўніцтва. ЦСПСБ у спэцыяльнай пастанове прэзыдыуму прызнаў правільнымі сыгналы друку, а[ртыкулы] „Труд" і „Зьвязды" і прапанаваў профсаюзам разгарнуць шырокую самакрытыку вакол сваёй работы, заклікаў усіх ударнікаў на ліквідацыю прарываў у профсаюзнай організацыі Беларусі.

Вывады газэты „Труд" і „Зь[вязда]" аб неабходнасьці аднаўленьня опортуністычнага кіраўніцтва ЦСПСБ, абходнасьці ўзмацненьня яго шляхам прыцягненьня да працы лепшых ударнікаў зусім правільныя.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, пры [ўдзе]ле ўсіх рабочых, супольнымі [сіла]мі ліквідуем прарывы ў ЦСПСБ.

ПАСТАНОВА

прэзыдыуму ЦСПСБ аб артыкулах у газэтах „Труд" і „Зьвязда"

1. Прэзыдыум ЦСПСБ, разгледзеўшы і абгаварыўшы артыкулы „Труда" і „Зьвязды" аб стане работы і кіраўніцтве ЦСПСБ лічыць, што зьмест артыкулаў зусім правільна адлюстроўвае значныя прарывы, якія маюцца ў рабоце і кіраўніцтве ЦСПСБ.

2. Прэзыдыум прызнае, што ня гледзячы на шматлікія прыклады гэроічнай работы пролетарыяту БССР па выкананьню промфінпляну, ліквідацыі прарываў, організацыі сустрэчнага промфінпляну, магутны ўздым спаборніцтва і ўдарніцтва, у выніку якіх маюцца бясспрэчныя дасягненьні ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве і соцыялістычнай рэканструкцыі вёскі,—профсаюзы БССР ня здолелі перабудаваць сваю работу адпаведна з патрэбнымі тэмпамі і на сапраўднаму ажыцьцёвіць паварот тварам да вытворчасьці ў а[дпаведн]асьці з дырэктывамі XIII [зьезду] КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б).

3. Прэзыдыум прапануе профорганізацыям шырока [выкары]стаць артыкулы „Труда" і „[Зьвязд]ы", разгарнуўшы самую шы[рокую] самакрытыку рабочых мас [вакол] усёй работы профорганаў [на] падставе рашэньняў XIII і зьездаў КП(б)Б і ЎсеКП(б) і вы ЦК УсеКП(б)—выпраўля[ючы кі]раўніцтва, сыстэму і зьмест работы зьверху данізу, ска[рыстаў]шы прапрацоўку для рашучай [пе]рабудовы профработы па мо[білізацы]ы мас на выкананьне задач [апош]нага трохмесячніку і III год[у пя]цігодкі, і на рашучую, бяз[літас]ную барацьбу з правым опо[ртунізм]ам у тэорыі і практыцы [пра]ху БССР.

ПАЗЫКА „ПЯЦІГОДКА—У 4 ГА[ДЫ"]

РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАЗЫКУ У ТЭРМ[ІН]

Бярэце прыклад

5-ая група Дараганаўскае сямігадовае школы колгаснае моладзі падпісалася на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады" на 200 рублёў і выклікае на соцспаборніцтва пятую групу Дараганаўскай вячэрняй школы і 5 групы яўрэйскай і беларускай Старадароскіх школ.

У фонд падпіскі на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады" вучні пастанавілі сабраць 150 кілёграм сыравіны, 45 мяхоў, 120 пудоў попелу, жалезны лом і выклікаюць астатнія школы насьледваць іх прыкладу.

Чаропка Ліда.

Падпісаліся на 60 проц. месячнага заработку

Рабочыя лесазаводу „Пролетары" (м. Старыя Дарогі) усе за выключэньнем 4 чалавек, падпісаліся на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады" на 60 проц. месячнага заработку.

Шванкоў.

З падпіскай дрэн[на]

[П]адпіска на пазыку „[Пяці]годка ў чатыры гады" ў [...]скім БПТ, двух і аднага[...] пэдкурсах праходзіць [...]зальняюча.

Да гэтага часу падпіска [на] ўсіх курсах не праведзена. [Ко]мольцы ў некаторых выпадк[ах] пуцца ў хвасьце беспартыйна[га сту]дэнцтва. Напрыклад, Лінік П[...] пісаўся на 50 проц. стыпэн[дыі, у] той час, як студэнты бесп[артый]ныя падпісаліся на 100 пр[оц.]

Салаў—студэнт 2-га [курсу], комсамолец, стыпэндыян[т, зу]сім адмовіўся ад падпіс[кі].

Бюро колектыву, асабл[іва ў] апошні час, гэтым пытаньн[ем не] займаецца.

Пост „Чырвонай Зьмен[ы"]

Уся ячэйка падпіса[лася]

Ячэйка ЛКСМБ колгасу „[...]молец" (в. Плоская, Хой[ніцкага] раёну) у 8 чал. падпісалася на „Пяцігоўка ў чатыры гады" 109 руб.

НА ШЛЯХУ ДА X ЗЬЕЗДУ ЛКСМБ

РАСЧЫНІЦЬ „СКАПІДОМКІ“ САЮЗНАГА ВОПЫТУ



Задачы шырокага асьвятленьня вопыту саюзнай работы на старонках нашай газэты зусім невыстарчальна рэалізуюцца шэрагам раённых арганізацый

ЯЧЭЙКІ І КАМІТЭТЫ, ВЫНОСЬЦЕ ЛЕПШЫЯ ВУЗОРЫ І ВОПЫТ САЮЗНАЙ РАБОТЫ Ў ГУШЧЫ КОМСАМОЛЬСКІХ МАС

Энтузіястыя колгасных палёў

Комунараўцы ў барацьбе з ашалелым кулацтвам

Колгас „Комунар“ арганізаваўся вясной г. г. з 12 гаспадарак і з першых дзён знаходзіўся ў абсяжным кольцы кулацтва, якое імкнулася разваліць колгас. Кулакі травілі нашыя пасевы, праганялі колгасьнікаў з палёў, адбіралі лепшую зямлю, сенажаць і травілі в усіх баках актывістаў-колгасьнікаў, сярод якіх налічваецца 13 комсамольцаў. Колгас не злажыў рук, а ўпарта ўзяўся за сваё замацаваньне.

Бальшавіцкімі тэмпамі закончылі ўборку і асеньнюю пасеўкампанію.

Упартая праца колгасьнікаў і ўдарная праца комсамольцаў умацнілі колгас. Колгас вырас за лік 2 бядняцкіх гаспадарак.

Цяпер у колгасе налічваецца 14 гаспадарак на плошчы 200 га.

Закончыўшы вясновую сяўбу, колгас узмоцнена рыхтаваўся да ўборачнай кампаніі. Быў своечасова складзены і зацьверджаны на агульным сходзе колгасьнікаў і комсамольскай ячэйкі плян уборкі, адрамантаваны машыны і закуплёна жатка.

Калі колгас прыступіў да ўборкі жыта, не хапала больш 1000 працоўных чалавека-дзён, але комсамольская ячэйка аб'явіла сябе ўдарнай і працавала ў выхадныя дні.

Дзякуючы ўдарнай працы комсамольцаў, своечасова закончана ўборка і абмалот збожжа. Асеньні сеў закончаны раней тэрміну на тры дні. Здалі ўжо дзяржаве 400 пудоў лішкаў жыта і здамо 1500 п. бульбы. Плян на засеву азімага клiну выканалі з перавышэньнем. Замест 50 га жыта і 2 га азімай пшаніцы, засеялі жыта 51 га і пшаніцы 3,5 га.

У час ўборкі і пасеўкампаніі асабліва па-ўдарнаму працавалі комсамольцы: Карпека Хвёдар, Панкрат М., Ждановіч В., Лякарскі Міша, Нябоскі і інш.

Колгас па-ўдрнаму закончыў ўборку 16 га бульбы.

Комсамольская арганізацыя колгасу сапраўды павярнулася тварам да колгаснa вытворчага паходу. Разьмеркаваньне ўраджаю яшчэ раз давяло калгасьнікам перавагу колектыўнай гаспадаркі над індывідуальнай. У сярэднім на кожную сям'ю прыпадае па 1200 руб. А заробак у дзень складае 2 руб. 25 кап.



Сіласная вежа, пабудаваная ў саўгасе імя Будзёнага

Арганізоўваем новыя колгасы

Комсамолія „Комунару“ не пакладаючы рук працуе па арганізацыі новых колгасаў. Дзякуючы прыкладнай працы колгасьнікаў, справядліваму разьмеркаваньню ўраджаю, прапрацоўцы пастаноў зьезду партыі і зловы ЦК УсеКП(б) сярод аднаасобнікаў, арганізаваны два новыя калгасы і дзьве ініцыятыўныя групы. У колгас „Ленінскі Шлях“ уступіла цалкам уся вёска з 25 гаспадарак і ў колгас „Партызан“ — з 15 гаспадарак. Сярод батрацка-бядняцкай часткі вёскі наглядаецца вялікі зрух у справе колектывізацыі.

Выяўляем свае недахопы

У сучасны момант самакрытыка пасьля раскопкі гнойніку ў Хутарскім сельсавеце і заціскачоў самакрытыкі, стала штодзённым бічом усіх недахопаў, як у працы колгасу, так і ў комсамольскай арганізацыі. Сіласную яму, якую трэ' было выкапаць па пляну, мы ня выкапалі.

Пытаньне сіласаваньня кармоў мы не наставілі ў парадак дня, што і прывяло пасьля да зрыву. Гэта наша памылка. Мы па-бальшавіцку яе прызнаем.

Барацьба на два франты

У час арганізацыі колгасу „Комунар“ Хутарская ячэйка вяла бязьлітасную барацьбу з правымі ў комсамоле. Два комсамольцы, Харытановіч і Хурсніч Я., выступаючы супроць колектывізацыі, адкрыта выявілі свой права-опортуністычны твар і выключаны з шэрагаў ЛКСМБ.

Былому сэкратару комсамольскай ячэйкі — кандыдату партыі т. Качану, які ставіў сваёй мэтай перавыхаваць дачок папа, дадзена вымова.

Ці гэта не дасягненьне?

За 4 месяцы наша комсамольская ячэйка, выкарчоўваючы правыя элементы з сваіх шэрагаў, узрасла за лік батрацка-бядняцкай колгаснай моладзі на 22 чалавекі. Да часу арганізацыі колгасу наша комсамольская ячэйка мела 7 чалавек, з якіх 2 былі выключаны. Цяпер ячэйка налічвае 25 чалавек, з якіх 9 батракоў, 2 рабочых, 5 беднякоў, 8 маламоцных серадвякоў-колгасьнікаў і 1 служачы. Мы маем у сваіх шэрагах адну дзяўчыну батрачку — калгасьніцу. Комсамольская арганізацыя на 200 проц. перавыканала заданьне па пасылцы комсамольцаў на Донбас.

У сучасны момант наша комсамольская арганізацыя мае вялікі аўторытэт, як сярод колгасьнікаў, так і батрацка-бядняцкай і серадняцкай часткі аднаасобнікаў.

Разам з сельсаветам

Працуючы па замацаваньню колгасу, мы прымаем актыўны ўдзел і ў працы ўсіх грамадзкіх і савецкіх арганізацый па тэрыторыі нашага сельсавету. Прыцягваючы да працы сельсавецкі актыў і арганізоўваючы навакол сябе беднату і батрацтва, мы маем посьпехі і ў выкананьні ўсіх бягучых кампаній па Хутарскім сельсавеце. Да верасьня месяца наш сельсавет быў апошнім па выкананьню мерапрыемстваў партыі на вёсцы. Клясавыя ворагі, на чале якіх стаяў сэкратар кандыдацкай групы КП(б)Б Калтовіч (цяпер выключаны з партыі), зрывалі соцыялістычнае ўдарніцтва на вёсцы. Цяпер наш сельсавет, пры актыўнай бальшавіцкай працы комсамольскай і партыйнай ячэек, стаіць на першым месцы ў Чэрвеньскім раёне па выкананьню ўсіх кампаній на вёсцы. У нас арганізаваны два колгасы і дзьве ініцыятыўныя групы па далейшай вярбоўцы ў колгасы.

Капаньне бульбы закончана, як у індывідуальным сэктары, так і ў колгасе. Бульбазагатоўкі выкананы на 80 проц. гадовага пляну, хлебазагатоўкі—на 70 пр. Па сельсавеце самаабкладаньне праведзена на 60 проц. ад агульнай сумы падатку. У далейшым комсамольская арганізацыя паставіла перад сабой мэту: аформіць арганізаваныя ініцыятыўныя групы ў в. Падасінаўка і Юравічы, падвоіць лік сем'яў колгасаў за лік аднаасобнікаў, падвоіць энэргію на выкананьне ўсіх задач, пастаўленых перад комсамолам 16-ым зьездам УсеКП(б) і 13 зьездам КП(б)Б.

Па даручэньню агульнага сходу комсамольскай ячэйкі

Міхась Раміта.

Узьнімаем зяб



Арэм апошнюю баразну

Лепшыя „ўзоры“... бязьдзейнасьці

Клімавічы, 26. (Па тэлефону ад нашага спэцкора).—Падрыхтоўка да зьезду праходзіць нездавальняюча. У загатоўках комсамольскія ячэйкі бязьдзейнічаюць. Не арганізавана ніводнага чырвонага абозу. Толькі 24 кастрычніка накіравана 15 чалавек на загатоўкі.

Справа ўсеагульнага навучаньня пад пагрозай зрыву, У раёне няма ведаў аб ахопе школамі вучняў. Шэраг школ не рамантаваны, няма настаўнікаў, заняткі не праводзяцца. Грамадзкасьць навакол усеагульнага навучаньня не мобілізавана. Комсамол бязьдзейнічае. У культэстафэту яшчэ ня ўключыліся. Пачалі агляд арганізацыі, арганізаваны пасты „Чырвонай Зьмены“.

Дамарацкі.

Адкрылася райконфэрэнцыя Сьмілавіцкай комсамоліі

Сьмілавічы, 26. (Па тэлефону ад нашага юнкора). Учора а 9-й гадзіне раніцы пачала работу раённая конфэрэнцыя Сьмілавіцкай арганізацыі ЛКСМБ. Конфэрэнцыя абгаварыла політычны даклад РК КП(б)Б і заслухала прывітаньне ЦК ЛКСМБ т. Самуціва.

Сёньня працягваюцца спрэчкі па політычнаму дакладу РК КП(б)Б.

Г. Фрыд.

У баку ад жыцьця (Сьмілавіцкі р-н)

Шэраг комсамольскіх ячэек Сьмілавіцкага раёну стаіць у баку ад усіх гаспадарча-політычных кампаній, якія праводзяцца партыяй і савецкай уладай. К прыкладу возьмем Рудзенскую ячэйку. У хлебазагатоўках, самаабкладаньні, рэалізацыі пазыкі „5-годка—у 4 гады“ і інш, ячэйка ніякага ўдзелу ня прымала. Дзень ураджаю і колектывізацыі не ўскалыхнуў яе. Ячэйка ня стала на чале колгаснага прыліву, наадварот—большасьць комсамольцаў самі не зьяўляюцца колгасьнікамі.

Хто ў гэтым вінаваты?

Часта бывае так: комсамольцы зьбіраюцца на сход, заслухоўваюць даклад сэкратара ячэйкі, або прадстаўніка райкому, а ў спрэчках—ніводнага запытаньня, ніводнага выступленьня, па дакладу прымаюцца рэзолюцыі і на гэтым разыходзяцца. Аб практычным ажыцьцяўленьні рэзолюцый ніхто ня думае. Бальшавіцкая самакрытыка на сходах не праводзіцца.

Хто-ж тут вінаваты? Трэба ясна сказаць, што ў першую чаргу вінавата кіраўніцтва ячэйкі і астатнія комсамольцы.

„Мая хата з краю“

Гэтыя словы можна часта пачуць ад комсамольцаў Караваеўскай ячэйкі.

Вёска Караваева павінна была даць дзяржаве 13 тон хлеба і 180 тон бульбы. Меркавалася на 23 кастрычніка арганізаваць чырвоны абоз з хлебам. Але меркаваньні так і засталіся меркаваньнямі,—чырвоны абоз ня быў арганізаваны. Ячэйка ў гэтым пытаньні нічога не зрабіла і ўрэшце плян хлебазагатовак выкананы на 30 проц., а бульбы на 40 проц.

Спадзяваньні на самацёк, схаваныя за шыльдай „мая хата з краю“, прывялі да зрыву пляну загатовак.

Адгарадзіліся ад батракоў

Па Рудзенскім сельсавеце налічваецца 30 батракоў ня ўцягнутых у комсамол. Ячэйка комсамолу адгарадзілася ад батракоў і не праводзіць ніякай работы па ўцягненьню іх у комсамол і ў колгас.

Так далей ня можа быць.

Мэтадамі ўдарніцтва і соцспаборніцтва выканаем заданьні партыі і савецкай улады. Самакрытыка павінна зьявіцца штодзённым дапаможнікам у працы комсамольскіх ячэек.

Юнкор Рыгор Малаток.

Патрабуем прачнуцца

Арганізацыі не разгарнулі ніякай падрыхтоўкі да правядзеньня віцебскай гарадзкой конфэрэнцыі комсамолу. Гарком абмежаваўся зьмяшчэньнем аб'явы ў мясцовай газэце аб тым, што назначаная на 18 кастрычніка конфэрэнцыя адкладваецца ў зьвязку з арганізацыяй чырвонага эшалёну бульбы.

У ячэйках і колектывах не праводзіцца ніякай падрыхтоўкі да конфэрэнцыі.

Ячэйкі, як заўсёды, па старому звычаю, чакаюць дырэктыў аб выбарах дэлегатаў.

У мясцовым друку „Віцебскі Пролетары“ няма ніводнага радка аб надыходзячай конфэрэнцыі.

Гаркому комсамолу неабходна зараз-жа распачаць падрыхтоўку да конфэрэнцыі.

Зэліксон.

Яч-кі Кармяншчыны не падрыхтаваны да райконфэрэнцыі

Падрыхтоўка да раённых конфэрэнцый у Кармянскай арганізацыі зусім не вядзецца.

Поўная непаваротлівасьць раённага кіраўніцтва адбіваецца і на працы комсамольскіх ячэек. Да сёньняшняга дня не мобілізавана ўвага комсамольскіх ячэек на падрыхтоўку да раённай конфэрэнцыі. Больш таго,—ячэйкі нават ня ведаюць аб тэрміне правядзеньня і парадку дня конфэрэнцыі. Зусім не папулярызаваны соцдагавор, які быў складзены паміж сэкратарамі раённых камітэтаў ЛКСМБ і рэдакцыямі газэт „Чырвоная Зьмена“, „Піонэр Беларусі“ і „Юнгер Арбэйтэр“.

Вынікі рашэньняў кастрычнікаўскага пленуму ЦК ЛКСМБ па арганізацыі не распрацаваны.

Асака.

Працу з беднатой узвальваюць адзін на аднаго

Матораўская ячэйка ЛКСМБ і Голацкі сельсавет (Сьмілаўскага раёну) зусім ня цікавяцца і не праводзяць ніякай працы з батрацка-бядняцкай часткай вёскі. Пастановы і рашэньні XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б не прапрацоўваліся на сходах беднаты.

Комсамольская ячэйка ўзвальвае работу з беднатой і батрацтвам на сельсавет, а сельсавет на комсамольскую ячэйку.

Важнейшыя гаспадарча-політычныя кампаніі прайшлі без актыўнага ўдзелу беднаты.

Такая права-опортуністычная недаацэнка работы з батрацтвам і беднатой з боку комсамольскай ячэйкі і сельсавету дала сябе адчуць на галоўным вучастку—прыліву ў колгасы.

У колгасы сельсавету няма прыліву батрацтва і бядняцка-серадняцкай часткі вёскі.

ВОЖЫК.

Кляса супроць клясы

Соцдэмократу Лебэ няма справы да загінуўшых

БЭРЛІН, 24. Комфракцыя Нямецкага рэйхстагу патрабавала ад старшыні рэйхстагу, соцдэмократа Лебэ, неадкладнага склíканьня сэсіі рэйхстагу для прыняцьця неабходных мер па аказаньню дапамогі ахвярам катастрофы ў шахце „Вільгэльм" ((Альсдорф), да ўстанаўленьня вінаватых у катастрофе асоб і аддаваньня іх пад суд.

Лебэ адмовіўся склікаць рэйхстаг.

Уся мэталяпрамысловасьць Нямеччыны рыхтуецца да забастоўкі

БЭРЛІН, 25. Усенямецкі камітэт рэволюцыйнай профопозыцыі і Цэнтральны забастовачны камітэт мэталістых Бэрліна зьвярнуліся да ўсіх мэталістых і да ўсёй рабочай клясы Нямеччыны з заклікам прыняць усе захады да падрыхтоўкі забастоўкі рабочых усёй нямецкай мэталяпрамысловасьці.

На ўсіх мэталязаводах неадкладна павінны быць скліканы баявыя камітэты.

Сходы рабочых на заводах павінны выпрацаваць патрабаваньні рабочых мэталістых.

Неадкладна павінны быць праведзены зборы сродкаў для падтрыманьня бастуючых мэталістых. Рабочыя ўсіх іншых галін прамысловасьці заклікаюцца да стварэньня камітэтаў солідарнасьці і збору сродкаў у карысьць мэталістых.

Гаспадар і „работнік"

Польскі ўрад абклаў опозыцыйных журналістых велізарным падаткам. Адказны рэдактар органу ППС „Работнік" заявіў у друку аб перамене ідэолёгіі.



— Дазвольце, ваша правасхадзіцельства, ідэолёгію перамяніць! Падаткі замучылі!

Пры дапамозе соцыял-дэмократаў павялічаны падаткі, урэзана дапамога беспрацоўным

БЭРЛІН. Нямецкі парлямант большасьцю галасоў зацьвердзіў патрабаваньні ўраду аб увядзеньні новых падаткаў на прадметы масавага спажываньня, аб урэзцы дапамогі беспрацоўным і скарачэньні зарплаты дзяржаўным служачым. У карысьць гэтых патрабаваньняў ураду ўдалося сабраць большасьць толькі дзякуючы падтрыманьню соцыял-дэмократычнай фракцыі парляманту.

Старшыня ўсенямецкага саюзу прамыслоўцаў Дуісбэрг заявіў, што ён цалкам падтрымлівае ўрадавыя мерапрыемствы. Ён, аднак, заявіў, што гэтыя мерапрыемствы павінны быць дапоўнены зьніжэньнем зарплаты прамысловым рабочым.

Міжнародны агляд

„Барацьба паміж старым і новым, паміж тым, што адмірае і нараджаецца,—вось аснова нашага разьвіцьця". (Даклад на XVI зьезьдзе ЎсеКП(б)—Сталін)

Справа з „Пан-Эўропай" правалілася. Зараз Францыя—гэты рэжысэр антысавецкага блёку камандыравала свайго маэстро—міністра гандлю Флянадэна, у краіны „вакол СССР" для сколачваньня антысавецкага блёку.

— Караул! Савецкі дэмпінг! Ратуйце!

Дэкрэт ад 3-га кастрычніка, забараняючы вольны доступ савецкім таварам, апублікаванае паведамленьне міністэрства бюджэту аб папярэднім дазволе на ўвоз савецкіх продуктаў,—усё гэта гаворыць за тое, што „францускія імпэрыялістыя жадаюць у першую чаргу дабіцца экономічнай ізоляцыі Савецкага Саюзу, зрабіць немагчымым савецкі вываз і тым самым сарваць тэмпы пяцігодкі".

Пад непасрэдным уплывам Францыі шэраг краін крычыць аб зараз модным „савецкім дэмпінгу".

Вэнгрыя зусім нядаўна па ўказцы францускіх імпэрыялістых прыняла захады супроць увозу савецкіх тавараў.

Румынія таксама ўзяла прыклад з сваёй „матулі—Францыі", якая абяцае ёй за гэта пазыку.

У Аўстрыі, Бэльгіі і Канадзе разгортваецца кампанія забароны ўвозу савецкіх тавараў.

У ПАЗШ Амэрыканская Фэдэрацыя Працы патрабуе забароны ўвозу савецкага лесу.

„Кампанія супроць савецкага экспорту мае на ўвазе не пасляблецьне экономічнага крызісу, а прасьледуе пэўныя політычныя мэты паасобных краін і агульную мэту ўсямернай барацьбы з Савецкім Саюзам. Задача гэтай кампаніі—падрыхтаваць грамадзкасьць да інтэрвэнцыі супроць СССР".

Зараз зусім відавочна, што Францыя падрыхтоўвае антысавецкі блёк усіх суседніх з СССР краін, краін Цэнтральнай Эўропы і Балкан. Францускі імпэрыялізм, у якога сарвалася справа з організацыяй „пан-Эўропы", думае сваімі буйнымі фінансавымі рэсурсамі, шляхам экономічнага пранікненьня жадае ўмацніць свае позыцыі ў Цэнтральнай Эўропе і на Балканах. Яна (Францыя) імкнецца ператварыць усе гэтыя краіны ў свае аграрныя калёніі, распаўсюдзіць сваё панаваньне на цэнтр і паўднёвы ўсход Эўропы і такім чынам стварыць сабе базу і магутныя арміі для паступовага наступленьня супроць Савецкага Саюзу".

Антысавецкая політыка францускага імпэрыялізму стала агульнай програмай усіх буржуазных партый Францыі. Усе, ад крайніх рэакцыянэраў да соц. фашыстых, крычаць аб пагрозе міру з боку СССР.

Буржуазія, задыхаючыся ў ціскох сусьветнага экономічнага крызісу, жадае „прымусіць Савецкі Саюз пакінуць вар'яцкую політыку сусьветнай рэволюцыі, якая праводзіцца Сталіным".

Францускі пролетарыят пад кіраўніцтвам сваёй компартыі пакажа, што ён бачыць у СССР ня ворага, а сябра, на абарону якога ён здолее выступіць у кожную хвіліну, пад як м-бы сьцягам напад ні падрыхтоўваўся.

Забастоўка бэрлінскіх мэталістых пашыраецца

Плян Юнга, які ўсёй сваёй цяжасьцю абрушыўся на пролетарыят Нямеччыны, зараз сустракае належны адпор з боку раб. клясы Нямеччыны. Забастоўка, абвешчаная бэрлінскімі мэталістымі ў адказ на спробу нямецкага імпэрыялізму рэалізаваць за лік рабочае клясы плян Юнга, пашыраецца. Па закліку компартыі і рэволюцыйнай профопозыцыі ў шэрагі бастуючых далучаюцца і іншыя заводы.

У буйным мэталюргічным цэнтры—Лімбаху сход мэталістых рашыў пачаць забастоўку солідарнасьці.

Шофэры таксі ўступілі ў шэрагі бастуючых.

Забаставалі рабочыя адной з рамонтных майстэрняў бэрлінскай падземнай чыгункі.

У розных галінах прамысловасьці, у розных канцох краіны расьце, мацнее і пашыраецца рух за актыўнае падтрыманьне бэрлінцаў.

У час, калі пролетарыят змагаецца пад кіраўніцтвам компартыі і рэволюцыйнай профопозыцыі, соц. фашыстыя і профбюрократы б'юцца ў пошуках спосабаў для зрыву стачкі.

Але гэта ім ня ўдасца. Соц. фашыстыя згубілі давер'е працоўных, якія вядуць сваю гэроічную барацьбу пад кіраўніцтвам компартыі і проф. опозыцыі. З кожным днём працоўным Нямеччыны становіцца ўсё ясьней, што рэформістыя жадаюць расстроіць шэрагі бастуючых.

Заява лідэра фашыстых Гітлера аб тым, што „набліжаецца момант, калі можна будзе скінуць маскі і паказаць кулак", яскрава гаворыць аб гэтым.

Комуністычная партыя і профопозыцыя ўзмацняе сваё кіраўніцтва ўзрастаючым рэволюцыйным рухам працоўных, якія давяраюць сваім кіраўнікам.

Стачка бэрлінскіх мэталістых—гэта ня простая стачка. Гэта прадвесьнік вялікіх рэволюцыйных боек.



Твар фашызму, які рыхтуе інтэрвэнцыю супроць СССР

Заходняя Украіна ў агні паўстаўньняў

Экономічны і політычны крызіс у Польшчы сьціскае і душыць фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага, якая знаходзіцца ў цесным саюзе з украінскай і беларускай буржуазіяй і кулацтвам.

Апошнія падзеі яскрава гавораць аб тым, што пілсудчына перашла ў наступ па ўсім фронце дзеля канчатковага афармленьня фашысцкай дыктатуры.

Ануляваньне самым бесцэрамонным чынам усіх не даспадобы Пілсудзкаму выбарчых сьпісаў, арышты прыкрых фашыстам людзей, пагроза фінансавага развалу, тэрор, голад і ўбоства сялян—усё гэта распаляе клясавую нянавісьць, усё гэта б'е па безьзямельных сялянах, якіх у Заходняй Украіне 90%, усё гэта садзейнічае шырокаму сялянскаму руху на Заходняй Украіне. Сяляне падпальваюць панскія маёнткі, адмаўляюцца ад плацяжоў падаткаў, змагаюцца супроць окупацыйных польскіх уладаў.

Аграрны крызіс, паглыблены ў Польшчы велізарнымі падаткамі і нячуванай эксплёатацыяй, даводзіць сялянскія масы Заходняй Украіны да нявыноснага становішча.

Гэроічнае супраціўленьне заходня-украінскага сялянства сустракаюць фашыстыя.

Забойствы, арышты, гвалты — вось сымбаль фашысцкай дыктатуры Польшчы.

Рух працоўных мас у Польшчы ўзьнімаецца на новую, больш высокую ступень.

„Комуністычныя партыі Польшчы і Заходняй Украіны павінны накіраваць сучасны рух заходня-украінскіх мас у організаванае рэчышча барацьбы супроць польскага фашысцкага ўраду і супроць усіх яго хаўрусьнікаў, якія жадаюць заліць Заходнюю Украіну крывёю і ператварыць яе ў плацдарм для наступу супроць СССР. Барацьба сялянскіх мас Заходняй Украіны супроць окупацкіх улад павінна быць цесна зьвязана з барацьбой польскага пролетарыяту супроць фашысцкай дыктатуры".

Загінулі сотні гарнякоў

БЭРЛІН. —У шахце „Вільгельм" (Рурская вобласьць) адбылася адна з самых страшэнных катастроф, якая ніколі ня мела месца ў нямецкай горнай прамысловасьці. Катастрофа выклікана выбухам 1500 кілёграм дынаміту.

* БЭРЛІН.—Па дадатковых вестках лічба гарнякоў, якія загінулі ў час катастрофы ў Альсдорфе, дасягае 231. Выцягнута толькі частка загінуўшых. Сярод разьмешчаных у больніцах 96 раненых гарнякоў, шмат пры сьмерці.

Па Савецкай Беларусі

„Колектывізацыя—ня наша справа"

У Новасёлкаўскім с-с., Пухавіцкага раёну, ніякай работы па колектывізацыі не праводзіцца. Партыйна-комсамольскія організацыі, а таксама сельсавет стаяць у баку ад гэтай важнейшай справы. Шмат якія ячэйкі комсамолу, як Новасёлкаўская, колгасу „Новае Ляддо", „Авангард" катэгарычна адмаўляюцца ад справы колектывізацыі, мотывуючы тым, што яны заняты важнейшай справай, ко[...]тывізацыя—ня іхняя справа.

Дзякуючы такім права-опортуністычным адносінам да справы [...]лектывізацыі ў сельсавеце [...] прыліву ў колгасы.

Райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ [па]вінны як найхутчэй прыняць [мера]ды да права-опортуністых з [пар]тыйнай і комсамольскіх ячэек [Но]васёлкаўскага с-с. Віш[...]

Колгасы Бягомельшчыны закончылі сяўбу і ўборку бульбы.

БЯГОМЕЛЬ, 24. (Па тэлефону ад нашага корэспондэнта). Капаньне бульбы і асеньні сеў у колгасах Бягомельшчыны скончан 21 кастрычніка. Мобілізаваная з 150 чалавек брыгада папрацаваўшы 450 дзён, выкапала 75 га бульбы. Ватнік.

Абараняюць кулака

Комсамольская ячэйка в. Язаў (Быхаўскі раён) стала на шлях абароны кулакоў.

Комсамолка гэтай ячэйкі—Пратасава Г.—нас ла падпісваць сялянам прыгавор аб тым, што гаспакарка Сушчынскага Алеся ня кулацкая, а серадняцкая і што ён увесь час ішоў за беднату. Пад гэтым прыгаварам было тры подпісы: Ціханенка, Лукашова і Пратасавай, але сэкратар ячэйкі—Сушчынскі Янка—не хацеў гэтым абмежавацца. Ён сказаў, што трэба зрабіць сход і даць выпіску з пратаколу з яго подпісам.

Ад гэтага сэкратара на агульных сходах ячэйкі можна пачуць, што зараз кулакоў у нас няма.

Язаўская ячэйка ЛКСМБ скацілася ў права-опортуністычнае балота. Райкому комсамолу трэба безадкладна зьвярнуць на яе належную ўвагу.

Л. К-ч.

Комсамольцы—організатары чырвоных абозаў

На ініцыятыве Буда-Кашалёўскіх комсамольскіх ячэек вёскі Буда-Кашалёўскага сельсавету організавалі 17 кастрычніка 5 чырвоных абозаў, якія здалі на станцыю 3 вагоны бульбы.

Пост „ЧЗ" Гарэлік, Малеў.

Засілосавалі 10 тон

Спачатку ўборачнай кампа[ніі сі]ламі комсамольцаў в. Скрыга[лава] Петрыкоўскага р-ну была выка[пана] яма ў колгасе „Праца".

Зараз-жа пасьля скачэньня [...]кі ячэйка прыступіла да заб[іўкі] гэтай ямы сілоснай масай.

Да гэтай справы былі пр[ыцяг]нуты і колгасьнікі і частка [студ]энтаў культуртэхнікуму. Усяг[о за]сілосавалі 10 тон.

Касіно[...]

Прыцягнуць да адказнасьці

У в. Глядовічы Стара-Даро[жскага] раёну ад чумы падохлі на 80 [...] сьвіньні. А райвэтпункт не з[...]дае ў гэтую вёску. Паслалі з[а] памогаю людзей, але вэт. урач [...] такі адмовіўся паехаць у вёск[у].

В. Пархімов[іч]

Комсамолец супроць пр[ые]му ў колгас

Ня так даўно адбыўся [агуль]ны сход колгасьнікаў „Расьс[вет] Пераможцы". На сходзе была р[азгле]дкавана адозва ЦК УсеКП(б), п[асьля] чаго адбыўся прыём новых сябр[оў у] колгас. Калі прымалі аднаго б[ядняка] з суседняй вёскі, комсамолец [мясцовай] гаснай ячэйкі—тав. Асмалоўскі [вы]ступіў супроць прыёму яго ў к[олгас], мотывуючы тым, што з суседні[х вё]сак прымаць немэтазгодна і [не]трэбна. Але колгасьнікі далі на[лежны] адпор Асмалоўскаму.

Ячэйцы-ж ЛКСМБ у сваю [чаргу] таксама трэба прыняць належны[я за]хады.

ПАЛЯЎЦОЎ

Адказны рэдактар—Рэдколе[гія]

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна Галоўлітбел № 5[...]